платформавага чахла з адзнакай іх металагенічнай спецыялізацыі, вызначэнні крыніц зносу матэрыялу ў басейны седыментацыі.

*Тв.:* Литология и геохимия кор выветривания, развитых на кристаллическом фундаменте Белоруссии. Мн., 1973 (разам з А.С.Махначом); Генетические особенности каолинитов Белоруссии. Мн., 1988; Коры выветривания запада Восточно-Европейской платформы. Мн., 1999.

**ЛЯПЁШКА** Барыс Міхайлавіч (н. 8.12.1955, г. Ваўкавыск Гродзенскай вобл.), бел. гісторык і філосаф. Канд. філас. (1996), д-р гіст. (2001) н., праф. (2003). Скончыў Гродзенскі ун-т (1978). З 1984 у Брэсцкім інж.-буд. ін-це.. З 1985 у Брэсцкіх гаркоме і абкоме КПБ, у 1991—95 і з 2001 у Брэсцкім ун-це (з 2001 дэкан юрыд. ф-та), у 1995—2001 — у аблвыканкоме. Даследуе праблемы філасофіі і метадалогіі гісторыі, логіку.

*Тв.:* Введение в методологию истории. Брест, 1997; Философский портрет В.Соловьева. Брест, 1997; Эвристическая роль аналогии в историческом познании. Брест, 1999; Метод аналогии в историческом исследовании. Брест, 2000; Homo historicus. Брест, 2001; Логические основы правовой практики. Брест, 2003; Введение в философию истории. Брест, 2003.

**ЛЯЎЧУК** Міхаіл Іванавіч (н. 14.7.1956, в. Малыя Зводы Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. фізік-тэарэтык. Д-р фіз.-матэм. н. (2000). Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1977). З 1982 у Ін-це фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па даследаванні эл.-магн. структуры нуклонаў і дэйтрона, фотанараджэнні π-мезонаў на нуклонах, інш. пытаннях эл.-магн. ўзаемадзеяння адронаў. Прапанаваў новыя метады вымярэння эл.-магн. палярызавальнасці нейтрына, што дало магчымасць эксперыментальна атрымаць больш дакладныя значэнні некаторых структурных пастаянных нейтрона.

*Тв.:* On approaches to measure the electromagnetic polarizabilities of the neutron (разам з Ф.Вісманам, М.Шумахерам) // Eur. Phys. Journ. 1998. Vol. A1, № 2; Deuteron Compton scattering below pion photoproduction threshold (разам з А.І.Львовым) // Nucl. Phys. 2000. Vol. A 674, № 3—4.

**ЛЯФАРАЎ** Анатоль Хрыстафоравіч (2.2.1913, г. Белагорск, Аўтаномная Рэспубліка Крым, Украіна — 10.2.1992), бел. вучоны ў галіне аўтамабіле- і трактарабудавання. Д-р тэхн. н. (1976), праф. (1977). Засл. машынабудаўнік Беларусі (1980). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1941). З 1951 нам. гал. канструктара Мінскага аўтамаб. з-да. У 1963—81 у БПІ (у 1963—74 заг. кафедры). Навук.-даследчыя і канструктарскія працы па праблеме павышэння праходнасці колавых машын — аўтамабіляў і трактароў.

*Тв.:* Блокирующие дифференциалы грузовых автомобилей. М., 1969 (разам з Л.А.Сцяпанавай); Дифференциалы автомобилей и тягачей. М., 1972; Энергонагруженность и надежность дифференциальных механизмов транспортно-тяговых машин. Мн., 1991 (у сааўт.).

*У.У.Яцкевіч.*

**ЛЯШЧОВА** Людміла Мадэстаўна (н. 28.2.1954, г.п. Руднічны Верхнякамскага р-на Кіраўскай вобл., Расія), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1998), праф. (2003). Скончыла Мінскі ін-т замежных моў (1976) і працавала ў ім. З 2000 заг. кафедры Ін-та дзярж. кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Даследуе лексічную семантыку, кагнітыўную лінгвістыку, праблему авалодвання роднай і замежнымі мовамі. Аўтар манаграфіі «Лексічная полісемія ў кагнітыўным аспекце» (1996), падручніка «Словы ў англійскай мове: Курс лексікалогіі сучаснай англійскай мовы» (2001), сааўтар і рэдактар навуч. дапаможніка «Практычная граматыка англійскай мовы» (у 4 ч., ч. 1—2, 2003—04) і інш.

**МАГАС**, горад, сталіца *Інгушэціі* з 1998.

**МАГІЛЁЎСКІ ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ІНСТЫТУТ** імя В.П.Кавалёва. Засн. ў 1993 у г. Магілёў В.П.*Кавалёвым* (гл. Дадатак) як недзярж. фінансава-эканам. ін-т. З 2001 сучасная назва. У 2003/04 навуч. г. адзін фінансава-эканам. ф-т; спецыяльнасці: камерцыйная дзейнасць (спецыялізацыя «Камерцыйная дзейнасць на рынку тавараў народнага спажывання»); фінансы і крэдыт (спецыялізацыя «Фінансы»); эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве (спецыялізацыя «Дзелавое адміністраванне»). Навучанне дзённае і завочнае, на камерцыйнай аснове. У ін-це 1146 студэнтаў, з іх 267 на дзённым аддзяленні. Навуч.-выхаваўчы працэс забяспечвае 71 выкладчык, у т.л. 37 д-роў і канд. навук. Мае камп'ютэрную залу, музей, б-ку. Штогод праводзяцца рэгіянальныя навук.-практ. канферэнцыі (Кавалёўскія чытанні).

**МАГІЛЬНЫ** Уладзімір Васілевіч (н. 5.12.1949, Мінск), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1998). Скончыў БДУ (1972), дзе і працуе. Навук. працы па фотафіз. і фотахім. працэсах у палімерах, стварэнні новых фотаадчувальных матэрыялаў для галаграфіі і інш. аптычных тэхналогій. Даследаваў пераўтварэнне энергіі электроннага ўзбуджэння і мадыфікацыі надмалекулярнай структуры неўпарадкаваных палімерных асяроддзяў. Распрацаваў новыя фотарэзістыўныя матэрыялы і кампаненты для іх вытв-сці, матэрыялы для запісу фазавых і палярызацыйна-фазавых галаграм.

*Тв.:* Динамика голограмм в полимерной среде, вызванная образованием противофазной дифракционной структуры (разам з Ю.У.Грыцаем) // Оптика и спектроскопия. 1997. Т. 83, № 5; Спектральная сенсибилизация фоточувствительности молекулярной среды акцепторами энергии электронного возбуждения // Журн. прикладной спектроскопии. 2001. Т. 68, № 1; Полимерные и фоторегистрирующие материалы и их применение. Мн., 2003.

**МАЖЭЙКА** Людміла Фёдараўна (н. 15.8.1958, в. Пігановічы Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі. Д-р мед. н. (2003). Скончыла Бел. мед. ун-т (1984), дзе і працуе (з 2002 заг. кафедры). Навук. працы па акушэрстве і гінекалогіі, эндаскапічнай хірургіі.

*Тв.:* Акушерские кровотечения, экстренная помощь. Мн., 1997 (разам з Г.І.Герасімовічам, Т.М.Калгушкінай); Основные методы исследования и оперативные вмешательства в гинекологии. Мн., 1999 (у сааўт.); Гинекологические нарушения у детей // Справочник врача женской консультации. Мн., 2001.

**МАЖЭЙКА** Марына Аляксандраўна (н. 16.3.1958, Мінск), бел. філосаф. Д-р філас. н. (2001), праф. (2003). Скончыла БДУ (1980), дзе і працуе з 1980 (у 2000—01 заг. кафедры). Навук. працы па сучаснай сац. філасофіі, філасофіі мовы, культуры і рэлігіі, семіётыцы, мастацтвазнаўстве і гісторыі некласічнага мастацтва, сінергетыцы і метадалогіі нелінейных аналітык. Рэдактар-складальнік анталогіі «Экалагічная думка ўсходніх славян» (1995), аўтар цыкла артыкулаў у энцыклапед. выданнях: «Сусветная энцыклапедыя: Філасофія», «Постмадэрнізм» (абедзве 2001), «Гісторыя філасофіі» (2002), «Сусветная энцыклапедыя: Рэлігія», «Навейшы філасофскі слоўнік» (абедзве 2003).

*Тв.:* Становление теории нелинейных динамик в современной культуре: Сравн. анализ синергет. и постмодернист. парадигм. Мн., 1999; Современная западная философия. Мн., 2000.

**МАЗАНІК** Сяргей Аляксеевіч (н. 10.11.1954, г. Магілёў), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1999). Скончыў БДУ (1977), дзе і працуе (з 1999 заг. кафедры). Навук. працы па звычайных дыферэнцыяльных ураўненнях і дыдактычных праблемах выкладання матэматыкі. Распрацаваў і дастасаваў метад пераўтварэнняў Ляпунова да даследавання лінейных дыферэнцыяльных ураўненняў. Пабудаваў тэорыю прыводных і асімптатычных эквівалентных алгебрадыферэнцыяльных сістэм.

*Тв.:* Курс дифференциальных уравнений. Мн., 1996 (разам з Ю.Багданавым, Ю.Сыроідам); Системы Лаппо-Данилевского во множестве линейных систем // Дифференциальные уравнения. 1999. Т. 35, № 1.

**МАЙЗЕЛЬ** Веньямін Міхайлавіч (20.6.1900, Мінск — 28.2.1943), украінскі вучоны ў галіне механікі. Чл.-кар. АН Украіны (1939). Скончыў Харкаўскі тэхнал. ін-т (1921). З 1922 працаваў інжынерам-канструктарам. З 1928 выкладаў у ВНУ Харкава (з 1928 праф.). Навук. працы па тэорыі гідратурбамашын, дынаміцы машын, тэорыі пругкасці і тэрмапругкасці. Распрацаваў эксперым. метад вызначэння мех. напружанняў, якія ўзнікаюць пад уплывам тэмпературы ў пругкіх сістэмах (метад М.).

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКИ